ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 8 (3512) ● ● ЧАЦВЕР, 23 ЛЮТАГА, 2017

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**“Смачна есці!” — казалі на фэсце**

Каманда Беларусі заваявала Гран-пры на другім Міжнародным кулінарным фэсце ў Кіеве Стар. 2




**Жыццёвая сіла селяніна** Стар. 3



**За сталом ніхто не лішні**

На свяце “Беларуская кухня” ў беларусаў Даўгаўпілса пабывалі госці з Бацькаўшчыны Стар. 4

ТРАДЫЦЫІ

# Каравай — на шчасце маладым

## Унікальны старадаўні вясельны абрад з Заходняга Палесся быў прадстаўлены ў Музеі беларускага народнага мастацтва

**Кацярына Мядзведская**

Ручнікі, хусткі, абразы, каравай, вянкі, званочкі… Усё тут мае асаблівае значэнне, свой магічны, сакральны сэнс. Ніводнай лішняй рэчы няма на выставе “Вяселле Заходняга Палесся”, што днямі адкрылася ў Музеі беларускага народнага мастацтва ў вёсцы Раўбічы. Захапляльную экскурсію па выставе праводзіла яе складальніца, загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела Беларускага дзяржмузея народнай архітэктуры і побыту Наталля Гермацкая. Гаварыла так вобразна і яскрава, што падалося мне: сапраўды ўдзельнічаю ў абрадавых дзеях. “Ажыўлялі” экспазіцыю і такія модныя сёння інтэрактывы, як танцы вакол “нявесты” са “свякрухай” ды гасцямі, фотасесія з вясельнымі вянкамі…

Заходняе Палессе — унікальны рэгіён. Там і па сёння захавалася шматгранная старажытная культура: фальклор, традыцыі ды абрады, промыслы і рамёствы. “На Палессі захаваўся і архаічны вясельны абрад са шматлікімі магічнымі рытуальнымі дзеяннямі, яркім каравайным абрадам, — казала Наталля. — А праводзілася гэта ўсё для таго, каб зрабіць шчаслівым жыццё маладых”. Там яшчэ да сватання існаваў абрад “Пярэпыты”: перапытвалі, ці згодна маладая выйсці замуж за хлопца. Рабіла тое звычайна сваха. І адзенне ў яе было яркае, з асаблівым галаўным уборам — з рожкамі, кветкамі альбо пер’ем. Часам прыходзіў “пытаць” і сам жаніх. Якраз на тым этапе мог атрымаць гарбуза: адмову. Калі ж нявеста была згодная, то на “Прадмове” рабіла падарункі: будучаму свёкру — ручнік, а свякрусе — хустку.

Знакавымі былі “Запоіны” з галоўнай абрадавай стравай: яечняй. Пра нявесту казалі, што яна “запіта” або “заедзена яечняй” да іншага роду, і з таго моманту яна ўжо не магла адмовіцца ад вяселля. Дарэчы, і ў адной з песень “Песняроў” ёсць словы “Заручоная і запітая…” Пасля маладая — на выставе яна прадстаўлена з павязаным на руку ручніком — запрашала гасцей на вяселле: калі ў хаце былі яшчэ незамужнія дзеўкі, то яна цягнула ручнік па падлозе: каб і сяброўкі хутчэй замуж павыходзілі.

Само ж вяселле пачыналася з каравайнага абраду, які доўжыўся цэлы дзень. Караваі пяклі, дарэчы, і ў хаце маладой, і ў маладога. Рашчыняць каравай і пячы яго маглі не ўсе. Галоўнай каравайніцай была хросная маці, астатнія жанчыны — усе замужнія, шчаслівыя лёсам, добрыя гаспадыні дый пявунні знатныя. На выставе прадстаўлены муляж каравая з вёскі Бездзеж Драгічынскага раёна Брэстчыны. Бывала, ставілі ў печ каравай у вялізнай форме, а ён вырастаў так, што дастаць яго было немагчыма. І тады разбіралі печ… Бо ламаць каравай нельга: ён — сімвал жыцця маладых. А старажылы палескіх вёсак дагэтуль упэўнены: можна ў царкве не вянчацца, але правесці каравайны абрад — абавязкова!

➔ Стар. 3



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

У вясельным абрадзе шмат асаблівых рысаў

ВЕСТКІ

## Фотапрывітанні з арбіты

**Ураджэнец Беларусі, камандзір касмічнага карабля “Союз МС-03” Алег Навіцкі публікуе ў Instagram фотаздымкі беларускіх гарадоў з борта МКС**

Ужо на працягу месяца касманаўт Алег Навіцкі радуе беларусаў здымкамі гарадоў з космасу, прычым не толькі начнымі, але й дзённымі. Апошнім разам ён размясціў на сваёй старонцы ў Instagram фатаграфіі сталіцы Беларусі з борта МКС у светлы час сутак. “Добрай раніцы ўсім зямлянам і асаблівы жыхарам Мінска!” — апублікаваў бадзёрае прывітанне ў сацсетцы Алег Навіцкі. Дарэчы, запіс усяго за гадзіну набраў звыш 1,5 тысячы лайкаў.

Раней касманаўт дзяліўся фатаграфіямі начнога Мінска з МКС, а таксама начных Брэста і Гомеля. “Я думаю, што гэта Брэст… — пісаў Навіцкі. — Пакуль былі пралёты, якія дазваляюць здымаць гарады Беларусі, зрабіў некалькі фотаздымкаў. Звяртаюся па дапамогу да маіх падпісчыкаў у Instagram. Падкажыце, ці сапраўды гэта Брэст??? Вельмі падобна”. Падпісчыкі запэўнілі касманаўта, што на фота адлюстраваны менавіта гэты беларускі горад.

Алег Навіцкі родам з горада Чэрвеня, што ў Мінскай вобласці. Гэта ўжо другі палёт яго ў космас. Першы раз быў на арбіце з кастрычніка 2012 па сакавік 2013 года: як камандзір карабля “Союз ТМА-06М”. І вось на МКС беларус адправіўся 17 лістапада 2016 года таксама як камандзір экспедыцыі.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Чараўнік народнай песні

**На Пружаншчыне, дзе 125 гадоў таму нарадзіўся Рыгор Шырма, ладзіліся розныя мерапрыемствы ў гонар знакамітага этнографа і дырыжора. Угодкі адзначаліся і ў іншых месцах Беларусі.**

Рыгор Раманавіч — адметная асоба, выдатны дзеяч беларускай культуры, стваральнік Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Рэспублікі Беларусь, якая з 1978 года носіць ягонае імя. Прыгожа, вобразна сказаў пра светлы талент народны паэт Ніл Гілевіч: “Колькі птахаў пявучых у родных лясах,/ Колькі нот непаўторных у іх галасах,/ Колькі тонаў, адценняў, ладоў, перабораў,/ Столькі песень у сэрцы дзядзькі Рыгора”. Памяць пра ягоную самадданую песенную працу жыве ў народзе, таму й адзначаўся юбілей як у Мінску, так і на Пружаншчыне: там, у вёсцы Шакуны, 20 студзеня 1892 года будучы маэстра нарадзіўся.

У Мінску, у гарадской Нотна-музычнай бібліятэцы 18 студзеня ладзіўся вечар, прысвечаны юбіляру. Сваімі ўспамінамі пра яго дзяліўся прафесар кафедры харавога мастацтва Беларускага дзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандр Жураў. Гэта, скажу з гонарам, мой дзядуля. Ён — старэйшы ўдзельнік знакамітай капэлы, шмат гадоў працаваў побач з яе стваральнікам. Аляксандр Васільевіч паведаміў шмат цікавага пра асобу Рыгора Раманавіча, пра адметнасці ягонай працы з хорам, канцэртную дзейнасць капэлы, а я паказваў на экране дакументальныя фота і відэа, ілюструючы аповед.

Разам мы паехалі й на Пружаншчыну, дзе цэлы тыдзень, з 20 па 28 студзеня, праходзілі розныя мерапрыемствы ў гонар юбілею знакамітага земляка пад назвай “Чараўнік беларускай народнай песні”. І ў першы ж дзень у Пружанскай дзіцячай школе мастацтваў прайшла ўрачыстая цырымонія гашэння маркі з выявай Рыгора Шырмы (мастак Яўгенія Бядонік). Як адзначыла дырэктарка Брэсцкага філіяла прадпрыемства “Белпошта” Вялянціна Пух, мініяцюрная выява — нібы яшчэ адна прыгожая кветка, якую мы ўплятаем у вянок памяці Рыгора Раманавіча. Спецыяльна выпушчана 50 тысяч паштовых канвертаў пойдуць па Беларусі, за яе межы. А “шырмаўская” марка стала нітачкай, якая звязвае Пружаншчыну з усім светам. Сімвалічна, што месцам гашэння, выхаду ў свет юбілейнай маркі сталі Пружаны, Дзіцячая школа мастацтваў, якая носіць імя Рыгора Шырмы, стаіць на вуліцы, названай у яго гонар, мае музей земляка.

➔ Стар. 3




Юбілейны канверт

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# “Смачна есці!” – казалі на фэсце

## Каманда Беларусі заваявала Гран-пры на другім Міжнародным кулінарным фэсце ў Кіеве

Мікалай Бойка

BESTCookFEST — гэта знакавы кулінарны і гастранамічны конкурс сярод кухароў, кандытараў, атэльераў, рэстаратараў. Гэта і цудоўная школа для тых, хто імкнецца развівацца, пашырае і ўдасканальвае майстэрства, узбагачае досвед па кулінарным і кандытарскім мастацтве. Фэст праходзіў у сталіцы Украіны на пачатку лістапада ўжо другі год запар. І ў чарговы раз засведчыў: кулінарныя традыцыі здольны аб'ядноўваюць народы.

Асаблівую цікавасць на фэсце выклікала намінацыя “Арт-клас”. Майстравалі ўсялякую смачную прыгажосць: цукровыя кветкі, кампазіцыі з пасцілажу і цукру, а таксама з марцыпаны, цеста, карамелі ды шакаладу, а яшчэ вясельныя і святочныя трох'ярусныя тарты, мастацкія вырабы з цеста. А пад час індывідуальных практычных класаў кухары гатавалі розныя стравы: вегетарыянскія, з мяса, з рыбы і морапрадуктаў, сучаснай кухні, нацыянальныя, рэстаранныя дэсерты.

Напружаным для ўдзельнікаў стаў конкурс “Chief Team 2016”. Заданне каманда з трох шэф-кухараў атрымала такое: прыкладна за паўтары гадзіны скласці, прыгатаваць і прадставіць меню з трох страў. Прычым сакрэтны спіс прадуктаў камандзе давалі за 20 хвілін да старту. Суддзямі былі лепшыя шэф-кухары з усяго свету, судзейскую калегію ўзначаліў прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі шэф-кухараў (WorldChefs) Томас Гуглер з Саудаўскай Аравіі.

У фэсце паўдзельнічалі лепшыя кухары і кандытары з Германіі, Італіі, Турцыі, Украіны, Францыі, Харватыі... Беларусь прадстаўлялі Дзмітры Місюк, Аляксандр Чыкілеўскі, Тацццяна Назарук, Арцём Лапіцкі, Наталля Стэфановіч (усе з Мінска) і Юры Колеснеў з Гомеля. Дарэчы, на першым фэсце, у 2015-м, нашы кухары, сябры Гільдыі кухараў і шэф-кухараў Беларусі Таццяна Назарук, Аляксандр Чыкілеўскі ды Павел Крычэўскі былі першымі ў камандным заліку, апярэдзіўшы каманды з Польшчы, Турцыі, Ізраіля, Харватыі, Украіны, Сербіі. Тады ж у індывідуальных спаборніцтвах яны заваявалі два залатыя медалі, два серабры, адну бронзу. Ад Гран-пры нашых тады аддзялялі ўсяго чатыры балы.

І вось на другім фэсце нашы яўна былі лепшымі. У індывідуальным першынстве беларусы заваявалі 7 залатых медалёў: Дзмітры Місюк (намінацыя BEST CHEF 2016); Аляксандр Чыкілеўскі ды Таццяна Назарук (стравы з рыбы і морапрадуктаў); Юры Колеснеў і Таццяна Назарук (стравы з мяса). Шэф-повар кандытар Наталля Стэфановіч за цукровыя кветкі (ангельская тэхніка) і торт заваявала адразу два золаты!

Сярэбранымі прызёрамі сталі Таццяна Назарук (рэстаранны дэсерт), Аляксандр Чыкілеўскі (страва з мяса) і Арцём Лапіцкі (страва аўтэнтычнай кухні). Ёсць у нашых і бронзавыя, але не менш дарагія для прызёраў узнагароды. У напружанай барацьбе яны дасталіся Арцёму Лапіцкаму, Дзмітрыю Місюку (стравы з мяса) і Юрыю Колесневу (вегетарыянская страва). Па выніках конкурсных дзён, у атмасферы пастаяннага кулінарнага суперніцтва беларуская каманда заняла першае агульнакаманднае месца і заваявала Гран-пры фестывалю BESTCookFEST-2016.

Аляксандр Чыкілеўскі, кіраўнік Гільдыі кухараў і шэф-кухараў Беларусі задаволены такім вынікам: “На гэты раз вельмі годна выступілі й маладыя прадстаўнікі каманды. Узяць чатыры прызавыя месцы — вельмі добры ўзровень!” А Таццяна Назарук, ганаровы сябар Гільдыі, выказала пажаданне, каб у такім фэсце ў будучыні паўдзельнічалі навучэнцы і студэнты адпаведных беларускіх навучальных устаноў. Дарэчы, ёсць на кіеўскім фэсце й спецыяльная намінацыя для юніёраў.



МІКАЛАЙ БОЙКА

Зорны час Таццяны Назарук

ВЕСТКІ

## Заспяваем з Песнярамі

**Улетку на фэсце “Маладзечна—2017” знакаміты аркестр Міхаіла Фінберга прадставіць праграму ў гонар 135-годдзя Якуба Коласа і Янкі Купалы. У яе ўвойдзе 38 твораў.**

Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі вызначаецца пашанай, увагай да беларускай песеннай творчасці. Сёлета ж ён ушануе класікаў: адкрые Нацыянальны фэст беларускай песні і паэзіі “Маладзечна–2017” новай канцэртнай праграмай у гонар 135-годдзя народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Кіраўнік аркестра Міхаіл Фінберг паведаміў: новая праграма знакамітага калектыву прысвечана юбілею Песняроў, заснаваная на іх творчасці. У яе ўвайшло 38 твораў: як ужо вядомыя песні ў новых аранжыроўках, так і малавядомыя. “Праграма цалкам гатовая, будзе прадстаўлена шырокай публіцы толькі на фэсце ў Маладзечне: на пачатку чэрвеня”, — удакладніў Міхаіл Фінберг. Ён лічыць: любоў да сваёй краіны, павага да нацыянальнага мастацтва — гэта прыкмета чалавека культурнага. З дапамогай такіх канцэртных праграм артысты сведчаць, наколькі прыгожая беларуская паэзія, музыка. Такімі скарбамі можна ганарыцца!

У новай праграме бяруць удзел 10 салістаў, сярод іх шмат маладых спевакоў. Па словах Маэстра, яны вельмі здольныя, выдатна спяваюць на розных мовах і пры тым любяць родную, беларускую.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Родныя людзі ў Заураллі

**У расійскім горадзе Кургане прайшла прэзентацыя кнігі “Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў Зауралля. Фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя”. Аўтар-складальнік яе — Людміла Урванцава.**

Чытачы газеты “Голас Радзімы” ведаюць: у Кургане працуе Беларускі нацыянальны культурны цэнтр “Батькавщина”, які займаецца адраджэннем, захаваннем, пашырэннем духоўных, гістарычных і культурных традыцый беларускага народа ў Курганскай вобласці. Дзякуючы актывістам цэнтра шмат можна даведацца пра Беларусь. Суполка рэгулярна праводзіць святы нацыянальнай культуры, выставы народнай творчасці. А таксама фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі ў глыбінку: каб сабраць там, у месцах кампактнага пасялення супляменнікаў, песенны, музычны фальклор, казкі, показкі, прымаўкі беларусаў, што жывуць у Заураллі. З цікавасцю знаёміцца даследчыкі-аматары з усім, што мае дачыненне да каляндарнай і сямейна-бытавой абраднасці супляменнікаў.

Суполку “Батькавщина” ведаюць і за межамі горада, яна не раз удзельнічала ў конкурсе сацыяльных праектаў (і тройчы станавілася прызёрам!) Уральскай федэральнай акругі, якая створана ў 2000 годзе ў межах Урала і Заходняй Сібіры. Адзін з праектаў-пераможцаў, пададзены суполкай, называўся так: “Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў Зауралля”. Пад яго былі выдзелены сродкі. А між тым экспедыцыі ладзіліся й раней. Паступова быў сабраны найбагацейшы матэрыял для кнігі пра нацыянальныя традыцыі зауральскіх беларусаў. Аўтар-складальнік выдання — Людміла Урванцава, старшыня суполкі “Батькавщина”, ініцыятар стварэння ансамбля “Журавачка”. Журналістам яна расказала: калі прыехала працаваць у Курганскую вобласць, то звярнула ўвагу: тут жывуць людзі розных нацыянальнасцяў. Маючы беларускія родавыя карані, паважаючы культуру продкаў, Людміла Рыгораўна вырашыла стварыць беларускую суполку: ёй ужо 13 гадоў. Праз некаторы час, як “Батькавщина” трохі стала на ногі, энтузіясты заняліся зборам беларускіх матэрыялаў. Паехалі па тых вёсках і сёлах вобласці, дзе беларусаў найбольш. Каля сямі гадоў сустракаліся з супляменнікамі, патрохі збіралі этнакантэнт, аглядаючы раён за раёнам: як кажуць, з міру па нітцы. Потым патрэбна было сабраны матэрыял апрацаваць, сістэматызаваць. Перамога ў конкурсе сацыяльных праектаў УрФА паспрыяла таму, што зборнік пабачыў свет. У ім, гаворыць Людміла Урванцава, сабраныя песні, апавяданні, трапныя выслоўі, успаміны беларусаў-старажылаў, адметныя рэцэпты розных страў ад гаспадынь, таксама пададзены фотаздымкі беларускіх касцюмаў, прадметаў побыту.



Людміла Урванцава з вясковымі супляменнікамі

Прэзентацыя кнігі прайшла ў Курганскай абласной навуковай бібліятэцы імя Аляксея Югава. Павіншаваць Людмілу Рыгораўну з падзеяй, адзначыць яе разам з беларусамі прыйшлі прадстаўнікі Урада вобласці, Асамблеі народаў Зауралля, абласной пісьменніцкай арганізацыі. Віншавалі энтузіястку, яе сяброў і калегі па прафесійнай дзейнасці, а таксама прыхільнікі таленту гурта “Журавачка”. Дарэчы, сярод песень, якія гучалі пад час прэзентацыі, былі й тыя, што запісаны ў этнаэкспедыцыях.

Уладзімір Уфімцаў, старшыня савета Асамблеі народаў Зауралля, лічыць: дзе б мы ні былі — варта памятаць пра свае карані. Звычайна так і бывае. Калі прадстаўнікі пэўнага этнасу прыязджаюць у нейкі край, застаюцца жыць, то прывозяць і свае традыцыі, побыт, абрады. А выданне кнігі пра сямейна-бытавую абраднасць беларусаў Зауралля, удакладніў Уладзімір Уфімцаў, дапаможа ўсім, хто пажадае, лепш ведаць беларускую культуру. Дарэчы, цяпер у Заураллі беларусаў — каля чатырох з паловай тысяч. Цікавасць да родавых каранёў у іх падтрымлівае БНКЦ “Батькавщина”, шмат у каго ў Беларусі па гэты час жывуць сваякі. З такіх, дарэчы, і Сяргей Вяроўкін, адзін з сяброў суполкі. Ён прызнаўся: амаль штотыдзень з Беларуссю на сувязі, там жывуць яго сваякі: пляменнікі ды пляменніцы. У Сяргея Андрэевіча захоўваюцца дома некаторыя рэчы з беларускім каларытам. Бывае, прывозіць ён і сувеніры з Бацькаўшчыны, дорыць нешта ў “Беларускую хатку”.

**Таццяна Макавеева,**
г. Курган

**Ад рэдакцыі.** Віншуем з выхадам каштоўнай кнігі, паважаныя беларусы Зауралля! Ваш досвед варты пераймання. І ў электроннай версіі кнігі “Белоруссы Зауралья”, дасланай у рэдакцыю, шмат цікавых матэрыялаў. Яна, аднак, падаецца нам, патрабуе ўважлівай карэктарскай працы. Нават па назве кнігі ёсць пытанні. Чаму “белоруссы”? Афіцыйная назва краіны ўжо больш за 25 гадоў — Рэспубліка Беларусь і Беларусь, па-руску адпаведна: Республика Беларусь і Беларусь. Такую назву зацвердзіў сваім Законам яшчэ Вярхоўны Савет БССР 19 верасня 1991 года — Закон лёгка знайсці ў інтэрнэце. Прычым у тэксце яго ёсць важная прыпіска: “Устанавіць, што гэтыя назвы транслітэруюцца на іншыя мовы ў адпаведнасці з беларускім гучаннем”. На жаль, у Расіі часам яшчэ з савецкіх часоў ужываецца назва “Белоруссия”. А назва народа “белоруссы” і ўвогуле дарэвалюцыйная…

Назва ж прэзентаванай кнігі па-руску: “Семейно-бытовая обрядность белорусов Зауралья. Фольклорно-этнографическая экспедиция”. А нядаўна Людміла Урванцава паведаміла, што “День единения народов Беларуси и России” (так у арыгінале) пройдзе сёлета ў горадзе Петухова Курганскай вобласці. Беларусы Зауралля вырашылі, што варта гэты дзень адзначаць “в месте компактного поселения белорусов”. І тут па назвах, як гаворыцца, няма ніякіх пытанняў.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Чараўнік народнай песні

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

На ўрачыстасці разам з Валянцінай Пух марку гасіў намеснік старшыні Пружанскага райвыканкама Мікалай Кудравец. Абодва паставілі подпісы ў альбомах, дзе будуць захоўвацца адбіткі гашэння: адзін — у паштовым музеі Брэста, а другі — у музеі ДШМ у Пружанах. Трымаючы ў руках юбілейны штэмпель, Мікалай Пятровіч казаў: для яго 1892-і важны й таму, што ў той жа год нарадзілася яго прабабуля. "Часта думаю пра Рыгора Шырму: ён з вясковай сям'і, змог атрымаць адукацыю, развіць здольнасці ды праславіць не толькі нашу Пружаншчыну, але і ўсю Беларусь… Вось адкуль гэты талент? — разважаў Мікалай Кудравец. — Відаць, шмат узяў чалавек ад нашай пружанскай пявучай зямлі, ад тых шчырых землякоў, з якімі вырас, ад бацькоў, бо гэта былі па-свойму творчыя і цікавыя людзі… Час бяжыць, і нам варта зрабіць як мага больш, каб Рыгора Шырму памяталі, у тым ліку й маладыя людзі".





Да вялікай духоўнай спадчыны Рыгора Шырмы ў Пружанах — вялікая павага

Вобраз Рыгора Шырмы ўжо быў і раней ушанаваны дзякуючы пошце. Пад час урачыстасці гаварылі: 10 студзеня 1992 года прайшло спецгашэнне мастацкага маркіраванага канверта, які выйшаў да 100-х угодкаў Рыгора Шырмы, а 10 красавіка таго ж года было спецгашэнне маркі "100 гадоў з дня нараджэння Р. Р. Шырмы". Марка пайшла ў свет тыражом 2,5 мільёны ў Маскве (мастак Б. Ілюхін). І вось Міністэрства сувязі ды інфарматызацыі Беларусі рэалізавала новы праект. Добрая традыцыя!

З цікавасцю ўспрынялі ўсе, хто прыйшоў на ўрачыстасць, аповед прафесара Аляксандра Журава. Ён расказаў пра першую сустрэчу з маэстра ў 1955 годзе, а таксама й апошнія, малавядомыя старонкі яго жыцця. Вось што я запісаў: "Ён мяне праслухаў і сказаў: "Добра, Шура, — так проста мяне заўсёды і называў — пайшлі ў аўдыторыю"… А там чалавек семдзясят. І ўсе як заспяваюць! Гэта было нешта чароўнае... І пасадзіў мяне Рыгор Раманавіч у першыя барытоны. На некаторых здымках я тут і ў вашым музеі ёсць: стаю ў чацвёртым радзе. Вось так увесь час і працаваў у Шырмы. І якія добрыя ў нас былі адносіны! Мне здаецца, я быў, мабыць, адзіны, з кім ён мог у любы час звязацца і пагаварыць. Можа, людзі саромеліся да яго падысці: маўляў, зорка, велічыня… А ён жа быў вельмі просты і шчыры чалавек… У апошнія гады быў нечым усхваляваны. Яму прыйшлося вельмі цяжка з-за нагавораў... Хтосьці наверх напісаў паклёп, пайшлі-закруціліся размовы. Ён усё ведаў, ва ўсякім разе, адчуваў. Рыгор Раманавіч не даказваў праўду, а моўчкі сышоў. Рэпетыцыя прайшла, ён пакланіўся на тры бакі, паклаў сваю дырыжорскую палачку — і пайшоў. І больш не вярнуўся…"

Прырода надзяліла Рыгора Раманавіча бездакорным слыхам і мастацкім густам. Не верылася нават некаму, што ён — з сялян, бо такая вытанчанасць была яму ўласціва. А між тым універсітэтаў, акадэмій не заканчваў. У 1905-м паступіў у Пружанскае гарадское вучылішча, пасля вучыўся на Свянцянскіх настаўніцкіх курсах ды на літаратурным факультэце ў Седлецкім настаўніцкім інстытуце (Польшча). У 1922-м Рыгор Шырма вярнуўся ў Заходнюю Беларусь, на Пружаншчыну. Захапіўся ж народнай беларускай песняй з дзяцінства, і ўжо ў час вучобы, настаўніцкай працы пачаў запісваць народныя песні, паданні.

У інтэрнэце я знайшоў запісы: "Адказны сакратар управы Таварыства беларускай мовы Рыгор Шырма не ведае стомы, ездзячы і ходзячы і па вёсках Заходняй Беларусі з лекцыямі, дакладамі, будзіць народную свядомасць, не дае згаснуць веры, актывізуе волю да барацьбы з цемраю і прыгнётам. Ён арганізуе ў Пружанах хор, запісвае народныя песні ды заахвочвае да гэтай працы здольных людзей, наладжвае канцэрты. Хутка выступленні хору, імя яго кіраўніка становяцца вядомымі па ўсёй Беларусі".

Дасведчаны фалькларыст, паэт Ніл Гілевіча лепшым выданнем беларускіх народных песень з нотамі за ўсю гісторыю беларускай фалькларыстыкі называў чатырохтомнік Рыгора Шырмы "Беларускія народныя песні": гэта вынік амаль 70-гадовай збіральніцкай і творчай дзейнасці падзвіжніка. Ён, нагадаем, аўтар запісаў, гарманізацый, музычнага афармлення і публікацыі каля 5000 беларускіх народных песень, шматлікіх артыкулаў, даследаванняў па пытаннях беларускага мастацтва, фальклору, харавога майстэрства. Ён жа складальнік шматлікіх фальклорных зборнікаў.

Талент, заслугі Рыгора Шырмы атрымалі з часам шырокае прызнанне: народны артыст БССР і СССР, Герой Сацыялістычнай Працы (1977), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржпрэміі БССР... Рыгор Раманавіч жыў і працаваў, не шкадуючы сябе, каб зберагчы душу народную — песню. Дзякуючы ягонай працы жывуць, гучаць бясцэнныя скарбы народнай творчасці. Некаторыя з песень мы пачулі на ўрачыстасці. Уявім сабе: свет непазнавальна змяніўся з таго часу, як Рыгор Раманавіч іх пачуў у народзе, запісаў, апрацаваў… Будзе і надалей усё мяняцца, а песні беларускія будуць жыць і, спадзяюся, не толькі ў нотах. Вось і на свяце ў Пружанскай ДШМ прыгожа выступілі як народны фальклорны гурт "Бабіна лета" з Аранчыцкага сельскага Дома фальклору, так і юныя артысты — з фальклорнага гурта выхаванцаў Пружанскай ДШМ.

На працягу "Шырмаўскага тыдня" розныя імпрэзы, выставы, творчыя сустрэчы ладзіліся і ў шэрагу сельскіх бібліятэк, школ раёна, Музеі-сядзібе "Пружанскі палацык" (фотавыстава "Рыгор Шырма: асоба і час"), раённым Дом рамёстваў, Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Міколы Засіма (выстава кніг "Сейбіт прыгажосці" ды вечар-партрэт "Чарадзей народнай песні"). А ў пружанскім саборы Аляксандра Неўскага прайшоў канцэрт духоўных хваласпеваў "Калі песня шчырая хвалое" — выступалі народны камерны хор гарадскога Палаца культуры і вакальны ансамбль "Амафор" Новазасімавіцкага сельскага Дома культуры. Ладзіліся экскурсіі "Творчымі шляхамі Рыгора Шырмы". А ў малой зале гарадскога Палаца культуры прайшло свята "Песня на ўсё жыццё".

**Васіль Жураў,**
**намеснік дырэктара здымачнай групы студыі "Летапіс" кінастудыі "Беларусьфільм"**

СПАДЧЫНА

# Жыццёвая сіла селяніна

**Іван Ждановіч**

**Пражыўшы нялёгкае жыццё, вядомы вучоны-гісторык Мікалай Улашчык зямны свой шлях давяршыў нарысам пра родную беларускую вёску Віцкаўшчыну**

На пачатку года прыйшла вестка: памяць пра земляка маскоўскія беларусы ўшанавалі салідна — у Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі. Там прайшла творчая вечарына — круглы стол "Мікалай Улашчык (1906—1986): Памятаем — Слухаем — Чытаем". А сабраліся беларусы з нагоды 110-й гадавіны ад нараджэння і 30-х угодкаў памяці гісторыка і літаратара. Як паведаміў на сайце ЗБС "Бацькаўшчына" Віктар Чайчыц, сустрэчу зладзіла Нацыянальна-культурная аўтаномія "Беларусы Масквы" ( у якой спадар Віктар — намеснік старшыні) пры падтрымцы дыпмісіі, з удзелам гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржуніверсітэта імя М. Ламаносава. Больш падрабязна пра тое чытайце ў цікавай публікацыі "З беларускай упартасцю": Аляксей Каўка пра Мікалая Улашчыка".

Сярод людзей, хто прыйшоў аддаць даніну павагі вялікаму і мужнаму чалавеку, быў гісторык-геральдыст Станіслаў Думін. Помніцца, я пісаў пра яго, бо пошукі, знаходкі вучонага тычацца і нашых тэрыторый, асабліва родаў татарскіх, якіх яшчэ з часоў Вялікага Княства Літоўскага тут няімала. І тады адкрылася, што паважліваму, удумліваму стаўленню да гісторыі спадар Станіслаў вучыўся якраз у беларуса Мікалая Улашчыка. І яшчэ: сам Станіслаў Уладзіміравіч мае родавыя карані з Беларусі.

Магчыма, нават дзеля таго, каб адшукаць сваю роднасці і блізкасць, варта нам заглядваць у гісторыю. І тут нам узорам можа быць Мікалай Улашчык. Гэта ён упершыню выдаў беларускія летапісы ў серыі "Поўны збор рускіх летапісаў": 32-і ды 35-ы тамы. На выставе ж у Пасольскім ДКК была прадстаўлена творчая спадчына вучонага. Што важна: да яе ёсць інтарэс! Бо там была і яго найноўшая кніга Даць народу гісторыю", выдадзеная ў Мінску — яе ўкладваў, прэзентаваў вядомы паэт, журналіст Міхась Скобла. Дэманстраваўся ў Маскве і відэазапіс выступлення вучонага ў тэлестудыі "Ліра" Беларускага тэлебачання ў лютым 1986-га.

Чым цікавы для нас жыццёвы досвед Мікалая Улашчыка? Не толькі тым, што ён з вёскі Віцкаўшчыны, з сялян Койданаўскай воласці (цяпер тэрыторыя Дзяржынскага раёна Міншчыны) выйшаў у вялікі свет: напрыканцы жыцця, да 1986-га, быў навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН СССР. Не толькі тым, што вядомым стаў і як доктар навук (гісторык, археограф, этнограф, краязнавец), і як літаратар. Галоўная перамога беларуса ў тым, што ён не здаўся, і застаўся нацыянальна свядомым, сумленным чалавекам, прайшоўшы праз сталінскія лагеры. Прычым — не аднойчы. Першы раз выпускніка педагагічнага факультэта БДУ арыштавалі ў 1930-м, калі прызвалі на вайсковую службу ў Ленінград. Абвінавацілі ў тым, што ён нібыта кіруе маладзёжным цэнтрам не існуючага "Саюза вызвалення Беларусі". Саслалі ў Вяцкую вобласць. Там — зноў арыштаваны ў 1932-м, пасля следства паўторна этапаваны ў 1933-м ужо ў Марынскі лагер (Новасібірская вобласць), а потым і ў Кемераўскую вобласць. Быў вызвалены восенню 1935-га — без права вяртання ў Беларусь. Ён так і працаваў педагогам у розных навучальных установах Расіі, у 1939-м аказаўся ў Ленінградзе — і там на пачатку вайны зноў быў арыштаваны, высланы... Цяжка пераказаць ягоную біяграфію. Звернем увагу: нават пасля вайны, у 1949-м, ужо калі працаваў у Маскоўскім




Вокладка кнігі, прэзентаванай у Маскве

універсітэце, ён быў звольнены з працы, потым — арыштаваны, і яшчэ амаль пяць гадоў быў у лагеры — да 25 сакавіка 1955 года.

І ўявіце сабе: пасля ўсяго гэтага ён змог зрабіць сваё жыццё. Вось дык сіла ў сына беларускага селяніна! Чытаючы, абдумваючы тое, што напісаў Мікалай Улашчык, можна павучыцца ў яго мудрасці вялікіх беларусаў: аніколі не трэба здавацца!

**ТРАДЫЦЫІ**

# Каравай — на шчасце маладым

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Пасля застолля ў доме маладой жаніх забіраў нявесту на вянчанне. Ехалі з гасцямі на 4-5 павозках, а далёка па наваколлі разносілася музыка бомаў. І гэта мела магічнае значэнне: звоны адганялі нячыстую сілу. На самім жа вяселлі "ачышчалі прастору "скрыпка, бубен, дуда... А каля варот маладых сустракалі бацькі, на вытаве апранутыя ў святочныя строі Століншчыны. Маці маладога частавала ўсіх мёдам і запрашала ў хату. Туды ж прывозілі й куфар нявесты з пасагам, які яна рыхтавала з 12-14 гадоў. А ў ім — абрусы, пасцельная бялізна, коўдры, пакрывалы, ручнікі, кашулі: усё для будучага жыцця.

І то былі апошнія хвіліны, калі нявеста магла пахваліцца вянком і касой. На Заходнім Палессі быў абрад "Пакрывала зняць". Яго і правялі ў Раўбічах для гасцей. "Свякруха" замест вянка завівала намітку і накідвала на галаву маладой хустку. Сэнс дзеі: маладая павінна была знікнуць на нейкі час, каб потым з'явіцца ў новай іпастасі — жонкі. Пасля маці маладога зрывала пакрывала і танчыла разам са свашкамі вакол нявесткі, перадаючы адна адной хустку. Такім чынам яны прымалі дзяўчыну ў свой гурт — жонак.



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

**Удзельніцы вернісажу ў нацыянальных строях з розных рэгіёнаў Палесся**

Асобная частка выставы ў Раўбічах мае назву "Экспедыцыйныя фотазамалёўкі Заходняга Палесся". Ёсць сярод іх фотаздымкі жанчын у традыцыйных святочных строях 1920-30 гадоў. Зазняў іх у вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна ў 1984 годзе вядомы этнограф Міхась Раманюк. Іншыя здымкі належаць супрацоўнікам Музея народнай архітэктуры і побыту Ганне Фурс і Алесю Крыштаповічу, якія зладзілі пастановачную "фотасесію" маладых людзей у вясельных строях 1920-х гадоў у вёсках Хабовічы Кобрынскага і Бездзеж Драгічынскага раёнаў. Экспедыцыя тая была ў 1985-м. Тады ж традыцыйнае адзенне, якое належала мясцовым жыхаркам, было перададзена ў музей. А праз 30 гадоў некаторыя элементы касцюмаў зноў пабачылі свет на вясельнай выставе. Усяго ў экспазіцыі прадстаўлена 10 заходнепалескіх святочных строяў канца XIX — сярэдзіны XX стагоддзяў.

Дагэтуль выставачны праект Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту "Вяселле Заходняга Палесся" з поспехам экспанаваўся ў Музеі народнага побыту Літвы. Плануецца, што ў Раўбічах выстава будзе да канца красавіка, пасля пераедзе ў Віцебск.

**КАРЫСНЫ ДОСВЕД**

# За сталом ніхто не лішні

## На свяце "Беларуская кухня" ў беларусаў Даўгаўпілса пабывалі госці з Бацькаўшчыны

Наша Беларускае культурна-асветніцкае таварыства "Уздым" запрасіла сяброў на чарговае свята "Беларуская кухня". Яно вельмі ўсім падабаецца — вось і вырашылі зноў накрыць стол. Я б яшчэ назваў нашу традыцыю: Свята беларускіх смакаў. Вядучымі свята былі Вольга Паўловіч і Галіна Сантоцкая: абедзьве гаспадыні знатныя. Кожнаму, хто ішоў на свята, прапанавалі яны нечым падзяліцца-пахваліцца, прынесці нейкую сваю фірмовую беларускую страву. Ну і ўсе як панеслі! Стол аж ламаўся, і не хапала месца для ўсіх прысмакаў, прыгатаваных гаспадынямі. Прыкладам, самая вядомая страва — аладкі — былі на розныя густы, больш чым у дзясятку варыянтаў. Аўтаамататары казалі: розныя опцыі... А яшчэ мачанкі, салянкі, закаткі... Было на што паглядзець і што пасмакаваць. І вельмі да месца прыйшліся на свяце самаробныя напоі: сокі ды віны. Была таксама зладжана прыгожая, хоць і невялікая, рознаколерная выстава ягад і гародніны — з дачных гаспадарак.

(Гэтае цікавае свята прайшло летась у верасні, а тэксту ўсё не было месца на старонках газеты: у нас, як кажуць млынары, вялікі завоз. Ды й цікавых іншых спраў у беларусаў Даўгаўпілса шмат. Мы вырашылі тэкст шаноўнага Міколы Паўловіча надрукаваць пад Масленіцу: гэта ж у тэму. Крэатыўна працуюць (і адпачываюць!) беларусы Даўгаўпілса! Мяркуем, каштоўны досвед спатрэбіцца і ў іншых суполках замежжа. — **Рэд**.)

На свяце нашым былі госці з Віцебшчыны, з горада Глыбокае: намесніца старшыні аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Таццяна Зеваліч, інструктар-метадыст па турызме раённага Фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Ала Галай, намеснік дырэктара Глыбоцых энергасетак Валеры Казак. Мы паказалі гасцям наш горад і крэпасць, беларускія мясціны Даўгаўпілса. Яны пабывалі ў Цэнтры беларускай культуры, пра дзейнасць якога цікава і грунтоўна расказала метадыст ЦБК Марыя Памецька.

Беларусы Даўгаўпілса заключылі пагадненне з Глыбоцкім райвыканкамам аб дальнейшым супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі і турызму. Госці падаравалі нам цудоўную лялечку, шмат інфаматэрыялаў пра Глыбоччыну. І "Уздым" падараваў сувеніры, газеты суполкі, друкаваныя выданні пра нашу дзейнасць. Сярод гасцей быў і новы творчы гурт "Лада"



МІКОЛА ПАЎЛОВІЧ

**Свята "Беларуская кухня" — цёплае і душэўнае**

(кіраўніца Вера Грынберт), які пажадаў далучыцца да нашага таварыства. Першае супрацоўніцтва было апрабавана ў мястэчку Опса, на Браслаўшчыне, калі святкаваўся Дзень беларускага пісьменства. На гэты раз гучалі песні на словы Станіслава Валодзькі і музыку Альберта Белуся, Андрэя Канавалава.

Вядучыя хораша вялі сустрэчу. На "Беларускай кухні" можна было пакаштаваць прысмакі, а таксама паслухаць прыказкі ды прымаўкі, разгадаць загадкі, пачуць цікавыя гісторыі пра беларускія стравы. Удзельніцы гурта "Купалінка" спявалі вясёлыя песні пра бульбу, зацірку і беларускую чарку. Госці ж нават прытанцоўвалі, пляскалі ў далоні, падпявалі ды частаваліся. Гаспадыні да таго ж абменьваліся рэцэптамі страў.

Паэт Станіслаў Валодзька таксама вялікі аматар беларускіх прысмакаў. Яны, падаецца мне, нават натхняюць яго часам на творчасць. На гэты ж раз ён парадаваў нас новым вершам "Ода бульбе". А Зінаіда Сіліня падзялілася ўспамінамі з ранняй гісторыі дзейнасці таварыства, спявала цудоўныя беларускія песні. Натхнёна, з душою чытала ўрывак з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" Тэрэза Паўлава, а Жанна Бяляўская хораша прачытала верш пра беларускую шынку. Так што была, як бачым, спажыва і для душы. Таму й свята прайшло ў надзвычай цёплай, душэўнай атмасферы.

**Мікола Паўловіч,**
сябра суполкі "Уздым"

**ЧЫТАЧ — ГАЗЕТА**

# Дапаможа інтэрнэт

**Актывістам беларускіх суполак замежжа, рыхтуючы святочныя мерапрыемствы, можна творча выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурсы**

Электронны ліст з эстонскай Нарвы накіравала нам у рэдакцыю кіраўніца суполкі "Сябры" Людміла Аннус. Піша: "Раней, калі фармат газеты быў на 12 старонак, то была рубрыка, пад якой друкавалі словы песень з нотамі, вершы. Было б выдатна, як мне падаецца, адрадзіць традыцыю. І пачаць з матэрыялаў да 135-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа. Шматлікім беларусам замежжа гэта будзе дапамогай, калі рыхтуем адпаведныя мерапрыемствы". Людміла прапануе весці рубрыку і пра творчасць сучасных аўтараў. Ёй вельмі падабаецца творчасць Міхаіла Скрундзя з Баранавіч, тамтэйшага самабытнага гурта "Фэст": "Колькім беларусам замежжа я перасылаю яго песні ў відэафармаце, а таксама ноты і словы! А з газеты — даведаліся б адразу многія!".

Мы падзякавалі спадарыні Людміле за прапанову. Вядома ж, калі б фармат газеты быў большым, то і розных кірункаў для публікацый знайшлося б. Шмат усяго цікавага можна публікаваць пра народныя святы і абрады, знакамітых суайчыннікаў, пра сучасных народных майстроў, творчых людзей... Аднак, маючы толькі 4 старонкі, мы выкарыстоўваем іх пераважна для таго, каб расказваць пра каштоўны досвед дзейнасці беларускіх суполак у свеце, падаем і цікавыя весткі пра жыццё на Беларусі. Не ўсе ж спяваюць, каб друкаваць ноты, вершы.

А выход прапануем такі: актыўней выкарыстоўваць розныя інтэрнэт-рэсурсы. Набярыце ў пошукавік хоць адзін радок з вядомага верша — і нешта знойдзецца. На розных сайтах (http://primanota.ru/syabry/ , http://vma-pesnyary.com/library/noti.php ) ёсць і ноты знакамітых песень з рэпертуару "Сяброў", "Песняроў". Шукайце — і знойдзеце.

Пайшлі, як кажуць, у шырокі свет і песні вядомага беларускага паэта з Даўгаўпілса (Латвія) Станіслава Валодзькі. Нядаўна ён даслаў у рэдакцыю кароткі ліст: "Дасылаю спасылкі. Па іх можна праслухаць некалькі маіх песень, размешчаных на сайце ЗБС "Бацькаўшчына". Дзякуем Станіславу — і дзелімся спасылкамі, бо шмат месца гэта не зойме: http://zbsb.org/node/11150 Яшчэ можна, адкрыўшы спасылку, замест апошніх пяці лічбаў падстаўляць вось гэтыя: 11200, 11256, 11182. Там ёсць 4 песні: у запісе артыстаў з Даўгаўпілса, а таксама і тэксты, і ноты, і нават мінус-фанаграмы. Зручна!

І пра юбілеі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Звяртайцеся непасрэдна ў музеі — сайты, кантакты для сувязі лёгка знайсці ў інтэрнэце. Альбо набярыце ў пошукавіку "поем песни и романсы на слова классиков (из фондов нбб" — знойдзеце шмат цікавага. І ўжо сабранага. А да юбілею класікаў будзе яшчэ больш.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк. **Тыраж:** 1930, **Заказ:** 247
**Час падпісання ў друк:** 20.10 Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2017